**Заданні для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове**

**A1**. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***а***:
1) м_татурыст;
2) мн_габаковы;
3) пл_вец;
4) р_ўнабедраны;
5) ст_гадовы

**A2**. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***е***:
1) с_наж;
2) ц_мнавокі;
3) рады_тэхніка;
4) св_шчэнны;
5) пав_сялець.

**A3**. Адзначце прыклады з правільным напісаннем падкрэсленых літар ***у/ў***:
1) вясна была ў разгары;
2) Заўральскі;
3) зноў узлятаюць;
4) руска-украінскі;
5) творы празаіка Уладзіміра Ягоўдзіка.

**A4**. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) вазмі;
2) аб'ехаць;
3) восемь;
4) вяселье;
5) легкавер'е.

**A5**. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) абмундзіраванне;
2) абезямелены;
3) артыллерыя;
4) гадзінікавы;
5) забалочанны.

**A6.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***д***:
1) яхі_ства;
2) Шмі_т;
3) пешахо_;
4) нака_чык;
5) па_касіць.

**A7**. Адзначце словы, якія маюць канчатак:
1) ноч;
2) рэле;
3) спачувальна;
4) твайму;
5) варыць.

**A8**. Адзначце словы, якія трэба пісаць ***праз злучок:***
1) (апенькі) верхалазы;
2) (авія) маяк;
3) (верша) складанне;
4) (вет) персанал;
5) (штабс) капітан.

**A9**. Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыналежныя прыметнікі пры дапамозе суфікса ***-аў-:***
1) Ніна;
4) дачка;

2) камендант;  5) стол.
3) Колас;

**A10**. Адзначце словы, якія трэба пісаць ***праз злучок***:
1) (верхне) дняпроўскі;  4) (мала) літражны;
2) (залаціста) чырвоны;  5) (мара) ходны.
3) (лячэбна) аздараўленчы;

**A11**. Адзначце сказы, у якіх ёсць безасабовыя дзеясловы ці асабовыя, ужытыя ў значэнні безасабовых:
1) Надзея Іванаўна суцішылася.
2) 3 палёў несла пахам сырой зямлі, свежай раллі і вячэрняй вільгаццю.
3) Пасыпаў дробненькі, гусценькі сняжок.
4) На ўсходзе пасвятлела.
5) Першы змогся бацька.

**A12**. Адзначце дзеясловы, якія у форме ***2-й*** асобы множнага ліку цяперашняга ці будучага простага часу маюць канчатак ***-аце (-яце)***:
1) азірацца;  4) вазіць;
2) апынуцца;  5) гукаць.
3) астрыгчы;

**A13**. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы трэба пісаць ***асобна***:
1) Алаіза *(між) волі* сціснула задубелыя пальцы.
2) Бэз расцвітаў *(як) раз* у час нашых школьных экзаменаў.
3) Восеньскія дзянькі стаяць *(на) дзіва* ясныя, цёплыя.
4) *(Дзе) кольвечы* ў канавах і ярах яшчэ ляжыць апошні снег.
5) Цягнецца луг далёка *(у) бок* лесу.

**A14**. Адзначце сказы, у якіх усе выдзеленыя словы з ***не, ні*** напісаны правільна:
1) У лістах сын *непакоіўся* пра маці, прасіў берагчы сябе і *не зважаць* ні на якія размовы.
2) Хата была вялікая, але *невыглядала* пустэльнай, халоднай і бязрадаснай.
3) Ранішняе сонца прыгожа кідае *не смелыя* праменьчыкі.
4) Як і ў старэйшых, у нас, дзяцей, *не было ніводнага* бесклапотнага дня.
5) Слязінкі ж, *непаспеўшы* збегчы кропелькамі па шчацэ, хутка замярзалі, утвараючы ледзяны панцыр.

**A15**. Адзначце сказы, у якіх на месцы ўсіх пропускаў ужываецца ***не***:
1) Чаго толькі _ было ў гэтым хмызняку, што цягнуўся за Куранямі.
2) У творчасці яшчэ _хто _ падняўся і _колі _ падымецца вышэй за народ.
3) У які бок _ глянуў бы, далячынь вырысоўваецца ясна і шырока і ўсё на зямлі выглядае выразна акрэсленым.
4) Вясною дажджы _ лішнія.
5) _ красак, _ зыкаў, замерла прырода...

**A16**. Адзначце ***дзеяслоўныя*** словазлучэнні:
1) бронзавы бюст;
2) апрануты па-вясковаму;
3) блішчаць на сонцы;
4) вывучыўшы верш;
5) далека ў лесе.

**A17**. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя словы – ***азначэнні***:

1) Вось тут пачынаецца *галоўнае.*
2) Дзень стаіць *ветраны.*
3) Вецер гнаў па дарозе *апалае з дрэў* лісце.
4) Людзі *ў белых світках* па высокай вадзе канала гоняць плыты аж у мора.
5) На полі раслі тры старыя грушы-*дзічкі.*

**A18**. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў ***абавязкова*** ставіцца працяжнік:
1) Асенні пералёт _ вялікая падзея ў жыцці птушак.
2) О Нарач! Сэрца я прынёс табе, валодаць ім _ тваё сягоння права.
3) Сад _ напоўнены цішынёй.
4) Першы дзень заняткаў _ як свята.
5) Пяць і дзесяць _ пятнаццаць.

**A19**. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску:
1) Я ляжу ў акопе на разасланым шынялі_ і доўга гляджу ўгору, у сінюю бездань летняга дня.
2) Часта здавалася, што душа гэтага чалавека ўвабрала ў сябе вялікую душу народа, яе весялосць і смутак _ радасць і гора _ яе шчырую даверлівасць і сумненні _ яе дапытлівасць і дасціпнасць.
3) Цёпла_ ярка свяціла сонца.
4) Кожны пакідаў птушкам свой пачастунак_ крошкі хлеба ці адну-дзве лыжкі салдацкай кашы.
5) Выліналы_ руды сабака ляжыць каля ног.

**A20**. Адзначце сказы, у якіх на месцы пропускаў трэба паставіць коску (коскі):
1) Зямля_ нібы падбадзёрваецца пасля навальніц.
2) Рукі халодныя_ бы ледзякі.
3) Паселішчы_ як і людзі_ без біяграфіі не маюць свайго аблічча.
4) Удзень жанчыны збіралі розныя зёлкі, сушылі і захоўвалі іх_ як моцныя цудадзейныя лекі.
5) Прачынаецца лес, звіняць прагалы_ быццам мнагаструнныя цымбалы.

**B1.** Устаўце прапушчаныя літары і знакі прыпынку ў прапанаваным тэксце.

Касавіца у(ў) Хатынічах пачалася кол..кі дзён назад. Першыя ка..цы накіраваліся на далёкі лу.. . Трава там была н.. дужа ядомая па нізінах асака на купінах с..вец. ***Аднак*** калі ..косіш маладую дык зімо.. пойд..е за мілую душу.

У вёсцы у(ў) гэтыя дні за..сёды панаваў асаблівы настрой. Ко..ны рыхтава..ся ..вонка і вес..ла стукалі мала..кі па металічных ба..ках а..цягваючы косы якія засумавалі за до..гую зіму па сака..ной траве і чыстай расе. Гаспадыні вышуквалі на дне кубел..цаў прыхаваны.. кавалкі сала бо ..даўна ведалі сал..ца н.. з'ясі не пацягне.. касы.

**B2.** Вызначце стыль і тып тэксту.

**B3.** У другім абзацы знайдзіце і выпішыце дзеепрыслоўны зварот.

**B4**. Вызначце правільнае сцверджанне ў дачыненні да слова, выдзеленага ў тэксце.
1) злучнік, які па сваім значэнні супадае са злучнікам ***і***;
2) часціца, якая з'яўляецца сродкам сувязі сказаў у тэксце;
3) злучнік, які з'яўляецца сродкам сувязі сказаў у тэксце;
4) часціца, якая па сваім значэнні супадае з часціцай ***але***;
5) злучнік, які не з'яўляецца сродкам сувязі сказаў у тэксце.